**ЗВАРОТАК**, слова або словазлучэнне, што абазначае асобу ці прадмет, да якіх звяртаюцца з мовай, заклікам, просьбай, якім наогул адрасавана выказванне.

З семантычнага боку зваротак – гэта імя, прозвішча асобы, назва асобы паводле сваяцкай, грамадска-сацыяльнай і нацыянальнай прыналежнасці, назва асобы паводле ўзросту і вызначальнай прыметы, назва жывой істоты, а таксама назва любога персаніфікаванага прадмета (у тым ліку і з'явы прыроды, абстрактнага паняцця і інш.): *Ксюшачка, Ксюшачка, вось табе падушачка* (П. Панчанка); *Сябры, каго вайна скасіла кулямі, дыханне ваша чую за спіной* (А. Куляшоў); *Гэй, варушыцеся, коні панурыя, досі ўжо працы, бо сонца зайшло* (М. Багдановіч); *Пакіну вам, мае сыны, мая малеча, свой росны ранак, сумны дзень, ласкавы вечар* (М. Шабовіч); *Я люблю цябе, лес, за тваю чалавечую шчодрасць, калі ты накрываеш абрусам паляны-сталы…* (Я. Сіпакоў); *Не трымайце ж мяне сёння, сцены хат, у лагодным палоне: над зямлёю шугае верасень – восені ветразь!..* (В. Зуёнак).

Некаторыя звароткі страчваюць сваё значэнне і ўжываюцца ў кантэксце ў якасці сяброўскага звароту да каго-небудзь: *Прыйдзі пад вечар ты на поле і палюбуйся ім, саколе* (Я. Колас); *– Давай, браце, падкіну! – параўноўваючыся з салдатам, спыніў …* [шафёр] *машыну* (А. Васілевіч); *– Да нас у госці прыязджай, мой дружа дарагі!* (Э. Агняцвет).

Зваротак выражаецца:

– назоўнікам у назоўным склоне: *Адгукніся, вясна, мне зязюляй з-за рэчкі* (А. Куляшоў); *Пойдзем, хлопцы, у тысячу кос смутак траў пераспелых касіць* (А. Астрэйка). *Даволі вам, госці, па лагеры бегаць* (П. Панчанка);

– назоўнікам у назоўным склоне з залежнымі ад яго словамі: *Не шумі, вецер-вольніца, соснаў ніц не схіляй* (А. Астрэйка); *Мой год, нам трэба даражыць хвілінамі* (А. Куляшоў); *Залатая, асенняя раніца! Харавством ты на свеце адна* (У. Дубоўка; *Частуйцеся печанай бульбай, мой добры сумленны сусед* (П. Панчанка);

– клічнай формай назоўніка ( утым ліку і з залежнымі словамі): *Смялей, беларусе-араты! Смялей уздымай к сонцу вочы* (Я. Купала); *Нічога, дружа, не тужы* (А. Астрэйка). *Уволю, браце, будзеш піць і сырадой, і скіслае* (Н. Гілевіч);

– прыназоўнікава-склонавым іменным спалучэннем: *Гэй, у хаце, адчыняйце, а то будзе горш*;

– сустантываванымі часцінамі мовы: *Малады і маладая, жывіце сто летак!* (Я. Купала). *Спі, маленькая, засні, слёзы з вочак, прагані* (А. Астрэйка);

– асабовым займеннікам: *"Эх, вы! Чаго расшумеліся?" – прамовіў пісар і ўсміхнуўся* (Я. Колас); *Гэй, ты! На гонары далёка не паедзеш! Садзіся. Давязу* (І. Шамякін);

– спалучэннем асабовага займенніка і назоўніка (тым ліку з залежнымі словамі): *Мая ты казка, мой ты сон, мой ранак спеўны, выратавальны парасон у дзень залеўны, дзе песня тоіцца твая, дзе сум начуе?* (М. Шабовіч);

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

– спалучэннем сінанімічнага характару: *Добрай ночы, зара-зараніца! Ужо імгла над зямлёю лажыцца, чорнай рызай усё пакрывае, пылам зор небасхіл абсявае* (М. Багдановіч);

– непадзельным словазлучэннем: *Дык здароў жа будзь, год Новы, сорак другі год* (Я. Колас).

Традыцыйна прызнаецца, што зваротак звязваецца са сказам сэнсавай (суадноснай сувяззю), якая выражаецца інтанацыйна. Аднак некаторыя мовазнаўцы (Наркевіч А.І, Чалюк Н.М. і інш.) мяркуюць, што сувязь зваротка з іншымі членамі сказа можа праяўляцца і граматычна. Граматычная сувязь праяўляецца паміж звароткамі і займеннікамі, паміж звароткамі і дзеясловамі-выказнікамі ў форме загаднага ладу або абвеснага ладу прошлага часу: *Ты будзеш, Случчына, ізноў і жыць і красавац, як сад* (А. Астрэйка). *Вось і прыйшоў ты дадому, салдат, у гімнасцёрцы сваёй зарудзелай* (П. Панчанка). *Добрая яблыня грому, радасцю поўні наўколле!* (Р. Барадулін).

Звароткі могуць размяшчацца на пачатку, у сярэдзіне і ў канцы сказа: *Паважаны рэдактар! Я вельмі Вас, вельмі прашу! Надрукуйце ў газеце ўсё, што я Вам напішу* (Н. Гілевіч); *Трубі, мой бор, трубі, іглісты, трубі, трубі ў ласіны рог* (П. Броўка); *Ці нашы сэрцы ва унісон заб'юцца ўранку, мая ты казка, мой ты сон, мар паланянка?* (М. Шабовіч).

Звароткі не з'яўляюцца членамі сказа, але характарызуюцца дваістасцю значэння і могуць зближацца па сваіх функцыях з дзейнікам, выказнікам і прыдаткам. Да дзейніка набліжаюцца звароткі, ужытыя ў імператыўных сказах: *Не прыпыняйся, не жахайся, слова!..* (А. Куляшоў). Выказнікавае значэнне найбольш выразна выяўляюць ацэначна-характарыстычныя кантактныя звароткі: *Эх, лета-лецейка любое, ты адцвітаеш, залатое!..* (Я. Колас). Ацэначна-характарыстычныя звароткі, размешчаныя ў дыстантнай пазіцыі, сінтаксічна набліжаюцца да прыдатка: *Перадай ты камандзірам наш паклон калгасны, перадай ад цэлай вёскі, мой саколік ясны* (А. Астрэйка).

Звароткі трэба адрозніваць ад вакатыўных сказаў (гл. **ВАКАТЫЎНЫ СКАЗ**) і назоўнага ўяўлення (назоўнага тэмы) (гл. **НАЗОЎНЫЎ ЯЎЛЕННЯ (НАЗОЎНЫ ТЭМЫ)**.

Вакатыўны сказ складаецца з назвы асобы – адрасата маўлення – і вымаўляецца з асаблівай інтанацыяй, якая перадае радасць, жах, здзіўленне, перасцярогу, папрок, дакор, абурэнне: *"Ох, таварыш-камандзір", – уздыхнуў дзед Талаш* (Я. Колас). Вакатыўныя сказы – гэта закончанае выказванне, якое не патрабуе пашырэння ў адрозненне ад зваротка.

Назоўны ўяўлення (назоўны тэмы) называе прадмет (з'яву, асобу) наступнай думкі, філасофскага разважання і заўсёды стаіць у пачатку сказа. Параўн.: *Дарогі, дарогі, дарогі… Колькі вас, брукаваных і шасейных, гравейных і селавых, насыпных і мокрых, гацевых, прайшлі людзі за гэты раз з табуном! Ужо намільгаліся і сталі звычайнымі краявіды вакол іх, ужо прывыклі ўсе да пылу, які, падняты тысячамі ног, заўсёды вісіць над дарогаю, там, дзе яны ідуць* (Я. Сіпакоў) і *Ой, дарогі вы, дарогі, колькі мы вас абышлі, да чаканай перамогі вы, дарогі, прывялі* (А. Астрэйка).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Паводле структуры звароткі падзяляюцца на неразвітыя і развітыя , а паводле асаблівасцей ўжывання – на адзіночныя, паўторныя і групавыя звароткі.

**Неразвітыя звароткі –** структурная разнавіднасць звароткаў, што выражаюцца адным словам (назоўнікам у форме назоўнага ці клічнага склону, займеннікам, субстантывам): *Ўстань, навальніца, мкні нанова* (М. Багдановіч); *Вецер, табе пагусці пара ў сонечных верхавінах* (П. Панчанка). *Прасілі талакою: – Піліпе, шавяліся, сыграй ты нам такое, каб грошы завяліся* (Р. Барадулін); *Каханая, мне скора трыццаць, а што ў жыцці зрабіць я змог?* (А. Астрэйка).

**Развітыя звароткі –** структурная разнавіднасць звароткаў, што выражаюцца словазлучэннямі, у якіх асноўны кампанент пашыраецца адасобленымі ці неадасобленымі (дапасаванымі або недапасаванымі) азначэннямі, прыдаткамі, дапаўненнямі, дадaнымі часткамі: *Гэй, ты, дзяўчына, кветка-лілея, вольная птушка сумнай зямліцы! Сееш ты слёзы, думак уроду, слёзы-брыльянты яснай крыніцы* (Я. Купала); *То любіць цябе мацней дазволь, беларуская мая краіна, шчасце маё, доля мая, боль* (А. Астрэйка). *Сябры, каго вайна скасіла кулямі, дыханне ваша чую за спіной* (А. Куляшоў).

Неразвітыя і развітыя звароткі могуць быць аднароднымі: *Дзень добры вам, лясы і далі, прасторы вольныя зямлі* (Я. Колас); *Да спаткання ж, рэчка! Да другога лета, дарагія пушчы, нівы і лугі* (П. Глебка). *Гэй, хлебаробы і докеры, грузчыкі і вуглякопы, кіньце супраць рэакцый гнеў барыкадны свой* (М. Танк).

**Адзіночныя звароткі** - разнавіднасць звароткаў паводле асаблівасцей ужывання, якія называюць адну асобу (прадмет, жывую істоту, з’яву) і адпаведна ўжываюцца ў сказе аднойчы: *Эх, слаўна ў лесе, слаўна, братцы!* (Я. Колас); *За тваю, дачушка, маці вораг галавой заплаціць* (А. Астрэйка). *Ды заўсёды такі насцярожаны крык твой, сойка* (П. Панчанка)

**Паўторныя звароткі** – разнавіднасць звароткаў паводле асаблівасцей ужывання, якія называюць адну асобу (прадмет, жывую істоту, з’яву) і паўтараюцца ў сказе са стылістычнай мэтай: *Гусі, гусі, вырай вольны! Сумен крык ваш, гусі* (Я. Колас); *Ах, восень, восень, ты пад сонцам неапісальнай пекнаты, ты раскідаеш, як чырвонцы, з кляноў чырвоныя лісты* (П. Броўка).

**Групавыя звароткі** – разнавіднасць звароткаў паводле асаблівасцей ужывання, што называюць групу асоб (прадметаў, жывых істот, з’яў), да якіх звяртаюцца з мовай: *Ой, лясы мае, паляны, шалашы, заставы, памнажаюць партызаны Беларусі славу* (А. Астрэйка).

Асноўная функцыя звароткa ў мове – намінацыйная, г. зн. функцыя называння таго, да каго звяртаюцца з мовай з мэтай яго ідэнтыфікацыі, а таксама з мэтай прыцягнуць увагу, выклікаць адпаведную рэакцыю ў чытача, пабудзіць яго да дзеяння: *Хай сэрца стане, сонца ў хмарах згіне, а ты, зямля, няспынным крокам кроч* (А. Куляшоў); *Радзіма мая дарагая, красуйся і ў шчасці жыві* (А. Бачыла); *Горад мой, ты сёння спаць не рай* (П. Панчанка).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Намінацыйная функцыя звароткa часта спалучаецца з ацэначна-характарыстычнай (эмацыйна-экспрэсіўнай) функцыяй, г. зн., функцыяй характарыстыкі, суб'ектыўнай ацэнкі таго, што названа. Такія звароткі, як правіла, выражаны назоўнікамі з ацэначнымі суфіксамі, характарыстычнымі назоўнікамі: *Грай, грай, жалеечка! Грай, грай, вясёлая! Выйграй з вясною і долечку мне* (Я. Купала); *Да нас ідзеце, дабрадзейкі! Пад наш цянёк хавайцесь, жнейкі!* (Я. Колас); *А ці дождж церусіць за сцяной, а ці сонца смяецца ўгары, ты заўсёды, мой любы, са мной. Гавары, мой сынок, гавары* (М. Шабовіч). Ацэначна-характарыстычная функцыя рэалізуецца таксама і звароткамі, якія суправаджаюцца выклічнікамі, часціцамі, ацэначнымі азначэннямі ці паўтараюцца з мэтай эмацыйнага ўзмацнення: *Эх, ты, лета, гарачае, бурнае! Ажыўляеш ты поле і луг* (Я. Купала); *Вецер, вецер, ты снег не гані, за зіму надакучыць мяцеліца* (А. Астрэйка); *Я ганаруся табою ў марах, адважны мой, каханы мой Ікар* (У. Караткевіч).

Зваротак у паэтычным творы – выразны прыём для ўзмацнення эмацыянальнай афарбоўкі выказвання, з дапамогай якога аўтар раскрывае свае думкі, пачуцці, свае адносіны да жыцця.

У беларускім мовазнаўстве апісанню зваротка ў розны час прысвяцілі свае даследаванні Т.П. Бандарэнка, Л.І. Бурак, А.І. Наркевіч, В.П. Русак, Н.М. Чалюк, М.С. Яўневіч і інш.

*С.С.Мароз*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ